# ПРАБЛЕМЫ АХОВЫ І МЫТНАГА КАНТРОЛЮ ПРАВОЎ НА АБ’ЕКТЫ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ УЛАСНАСЦІ Ў ЕЎРАЗІЙСКІМ ЭКАНАМІЧНЫМ САЮЗЕ

**Д. А. Белая[1)], Л. І. Тарарышкіна[2)]**

*[1)] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, belayaa_1903@mail.ru*
*[2)] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, tararyshkina@bsu.by*

У кантэксце еўразійскай інтэграцыі, у рамках якой краіны-ўдзельніцы імкнуцца да больш цеснага эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва, менавіта пытанні аховы інтэлектуальнай уласнасці становяцца больш актуальнымі. Важнасць выкарыстання агульных падыходаў усімі дзяржавамі — членамі Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС) для прадухілення парушэнняў правоў на аб’екты інтэлектуальнай уласнасці ў сучасных умовах значна павялічваецца праз рост электроннай камерцыі і патокаў кантрафактнай прадукцыі. Немалаважную ролю адыгрываюць і скаардынаваныя дзеянні праваахоўных органаў і супрацоўніцтва з інтэрнэт-кампаніямі для барацьбы з парушэннямі. У артыкуле апісаны ключавыя праблемы аховы і мытнага кантролю правоў на аб’екты інтэлектуальнай уласнасці у ЕАЭС, а таксама прапанаваны іх магчымыя рашэнні.

***Ключавыя словы:*** аб’екты інтэлектуальнай уласнасці; кантрафакт; паралельны імпарт; Еўразійскі эканамічны саюз; Адзіны мытны рэестр аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці.

# CHALLENGES IN PROTECTION AND CUSTOMS CONTROL OF INTELLECTUAL PROPERTY RIGHTS IN THE EURASIAN ECONOMIC UNION

**D. A. Belaya[a], L. I. Tararyshkina[b]**

*[a] Belarusian State University,*
*4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, belayaa_1903@mail.ru*
*[b] Belarusian State University,*
*4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, tararyshkina@bsu.by*
*Corresponding author: D. A. Belaya (belayaa_1903@mail.ru)*

In the context of the Eurasian integration, within which the member states strive for closer economic and cultural co-operation, issues of intellectual property protection are becoming more relevant. In current circumstances, importance of using common approaches by all Eurasian Economic Union member states to prevent infringement of intellectual property rights is significantly increased due to the growth of e-commerce and the flow of counterfeit goods. Coordinated actions of law enforcement agencies and partnership with Internet companies to combat infringements also play an essential function. The article describes key challenges in protection and customs control of intellectual property rights in the EAEU and suggests possible solutions.

***Keywords:*** intellectual property objects; counterfeiting; parallel import; Eurasian Economic Union; Single customs register of intellectual property objects.

Сёння ў кантэксце еўразійскай інтэграцыі значнасць набывае выкарыстанне ўсімі дзяржавамі — членамі Еўразійскага эканамічнага саюза (далей — ЕАЭС) агульных падыходаў пры фарміраванні правапрымяняльнай практыкі, якая б забяспечвала прадухіленне і максімальнае спыненне парушэнняў правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці (далей — аб'екты ІУ).

Праз актыўнае развіццё электроннай камерцыі, у тым ліку і ў ЕАЭС, рынак інтэрнэт-гандлю якога вырас больш чым на 40% за апошнія тры гады, павялічваецца і колькасць кантрафактнай прадукцыі на дадзеным рынку. Гэта адбываецца на фоне спрашчэння бізнес-працэсаў у сетцы Інтэрнэт і росту колькасці карыстальнікаў, што стварае сур'ёзную пагрозу для традыцыйных сістэм паставак і павялічвае колькасць парушэнняў аўтарскіх і сумежных правоў. У такой сітуацыі ўзнікае неабходнасць эфектыўнай абароны анлайн-прастор ад дадзеных тавараў як унутры ЕАЭС, так і на глабальным узроўні.

Адна з праблем абароны правоў на аб'екты ІУ — недастатковае развіццё адносін супрацоўніцтва паміж уладальнікамі правоў на аб'екты ІУ і інтэрнэт-кампаніямі. Больш за тое, адзначаецца складанасць дакладнага вызначэння аб'ёмаў кантрафакту ў сувязі з неабходнасцю правядзення вялікай колькасці кантрольных закупак, аналізу сапраўднасці і далейшага пацверджання правоў на гандлёвыя знакі. Злачынцам становіцца лягчэй схавацца дзякуючы інфармацыйным тэхналогіям (далей — ІТ), яны выкарыстоўваюць ананімныя тэлефонныя нумары, бо падманваць пакупнікоў на адлегласці значна прасцей. Раней спажывец мог хоць бы агледзець тавар перад купляй, але цяпер, калі пакупкі можна рабіць праз Інтэрнэт, ён не мае магчымасці ацаніць якасць, сертыфікаты і ліцэнзіі прадаўца да фактычнай куплі тавару.

З аднаго боку, ЕАЭС значна спрашчае міжнародны гандаль, анулюе адміністрацыйныя і фінансавыя бар'еры. Але ж іншага — стварае ўмовы для распаўсюджвання кантрафактнай прадукцыі, бо аб'ём падробак складана вызначыць, у тым ліку без пастаяннай арганізацыі кантрольных закупак і экспертызы. Таму пры ацэнцы інфармацыі эксперты ўлічваюць статыстыку падробак, якія былі раскрытыя праваахоўнымі органамі, колькасць судовых разглядаў, афіцыйныя заявы органаў дзяржаўнага кантролю, вынікі апытанняў грамадскай думкі. Аднак усе гэтыя дадзеныя не з'яўляюцца поўнымі і часта няправільна інтэрпрэтуюцца.

Даволі яскрава на ўзроўні ЕАЭС праяўляецца і праблема адсутнасці адзіных ды ўніфікаваных прынцыпаў вычарпання правоў на таварныя знакі і іншыя аб'екты ІУ (да 2012 г. у Беларусі і Расіі яшчэ дзейнічаў нацыянальны прынцып вычарпання выключных правоў уладальніка на таварны знак, а ў Арменіі і Казахстане — міжнародны прынцып). Сёння на ўсёй тэрыторыі ЕАЭС дзейнічае прынцып рэгіянальнага вычарпання выключных правоў уладальніка таварнага знаку (замацаваны ў пункце 16 Пратакола аб ахове і абароне праў на аб'екты ІУ, які з'яўляецца дадаткам № 26 да Дагавора аб ЕАЭС, і ў пункце 4 артыкула 3 Закона «Аб таварных знаках і знаках абслугоўвання») [1].

З указанай вышэй праблемай звязаныя таксама і пэўныя нюансы паралельнага імпарту (увоз такой прадукцыі, якая выраблена і маркіравана таварным знакам вытворцы, але ж была імпартавана без яго згоды). З аднаго боку, адбываецца паніжэнне коштаў на прадукцыю, пры якім канчатковы спажывец застаецца ў выйгрышы, а легальны праваўладальнік, што раней дазваляў сабе бязладна завышаць цану на прадукцыю праз магчымасць быць манапалістам, будзе адэкватна ацэньваць падыходы да ажыццяўлення сваёй прадпрымальніцкай дзейнасці. А вось з іншага боку, паралельны імпарт нельга лічыць надзейным спосабам фарміравання канкурэнцыі на галіновых рынках, бо канкурэнцыя сярод пастаўшчыкоў ідэнтычнай прадукцыі не аказвае істотны ўплыў на паніжэнне цэн і паляпшэнне ўмоў тавараабароту ў межах рынку (тут менавіта канкурэнцыю паміж праваўладальнікамі можна аднесці да больш эфектыўнага спосабу павышэння ўзроўню развіцця канкурэнтаздольнасці), а паралельны імпарт — аснова для арганізацыі ды далейшага развіцця нядобрасумленнай канкурэнцыі, якая з'яўляецца даволі маштабным і найбольш распаўсюджаным антыманапольным парушэннем на тэрыторыі ЕАЭС [2].

Існуе настойлівая неабходнасць павышэння дасведчанасці аб маштабах праблемы кантрафакту. Адказнасць за гэта шырока распаўсюджана, і органы аховы здароўя, гандлёвыя арганізацыі, групы спажыўцоў і іншыя зацікаўленыя бакі, у тым ліку, грамадства, могуць адыграць значную ролю ў інфарміраванні людзей аб рызыках для здароўя і бяспекі кантрафактных тавараў. Прыватныя кампаніі, якія ўдзельнічаюць у такім гандлі, павінны быць пералічаныя, а іх дзейнасць павінна шырока асвятляцца ў сродках масавай інфармацыі.

Праваахоўныя органы дзяржаў — членаў ЕАЭС павінны дзейнічаць разам і займаць больш жорсткую пазіцыю адносна вытворцы і пастаўшчыкоў такой прадукцыі, і гэтая пазіцыя ў канчатковым выніку павінна быць падмацавана адэкватным і усеабдымным заканадаўствам. Зараз менавіта скаардынаваныя дзеянні на ўзроўні дзяржаў-членаў ЕАЭС маюць жыццёва важнае значэнне для выяўлення, расследавання ды судовага пераследу гэтых злачынстваў. Так, адным з накірункаў, дзе адсутнічаюць меры, з'яўляюцца ашуканскія інтэрнэт-аптэкі, якія павінны кантраляваца добрай сістэмай маніторынгу для адсочвання крыніц патэнцыйнага парушэння і захопу IP-адрасоў.

На сённяшні момант мытная абарона правоў на аб'екты ІУ ў ЕАЭС — даволі складаная шматузроўневая сістэма, якая павінна прадугледжваць выкарыстанне агульнага «рамачнага» выкладання асноўных прынцыпаў і спосабаў ажыццяўлення, аднак асобныя непасрэдныя інструкцыі фарміруюцца краінамі-ўдзельніцамі самастойна. Хоць асноўныя палажэнні адлюстроўваюць палажэнні Пагаднення па гандлёвых аспектах правоў ІУ (ТРІПС), сама форма міжнароднай эканамічнай інтэграцыі прыводзіць да ўнікальных адрозненняў (шматэтапная сістэма заканадаўства ў галіне мытнай абароны правоў на аб'екты ІУ, розная ступень ўдасканалення нацыянальнага заканадаўства з улікам актуальных

задач сацыяльна-эканамічнага развіцця, іерархічная сістэма мытнага рэестру аб'ектаў ІУ (далей — МРАІУ) [3]. Стратэгія аховы, абароны і выкарыстання інтэлектуальнай уласнасці ЕАЭС дазваляе гарманізаваць нацыянальныя Стратэгіі, мінімізаваць колькасць магчымых спрэчных сітуацый, задаць агульныя для дзяржаў — членаў ЕАЭС арыенціры [4]. Меры, адлюстраваныя у Стратэгіі Рэспублікі Беларусь у сферы ІУ да 2030 г., сталі неабходнымі як дзеля павышэння інвестыцыйнай прывабнасці інавацыйнай дзейнасці, якая праводзіцца ў рамках ЕАЭС, рацыяналізацыі ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур, што звязаныя з забеспячэннем прававой аховы аб'ектаў ІУ, так і дзеля стымулявання стварэння, далейшай камерцыялізацыі аб'ектаў ІУ, развіцця экспартнага патэнцыялу краіны, запатрабаванасці беларускай прадукцыі на знешніх рынках.

У адпаведнасці з пунктам 10 артыкула 385 Мытнага кодэкса ЕАЭС, Еўразійская эканамічная камісія (далей — ЕЭК) мае паўнамоцтвы зацвярджэння Рэгламенту вядзення дзяржавамі-членамі Адзінага МРАІУ, які быў сцверджаны рашэннем Калегіі ЕЭК ад 6 сакавіка 2018 г. № 35 і які павінен вызначаць:

— патрабаванні да афармлення і разгляду заявы праваўладальніка, складу звестак і дакументаў, што прадстаўляюцца;

— тэрмін і парадак разгляду заявы;

— парадак уключэння і выключэння аб'ектаў ІУ з Адзінага МРАІУ;

— унясенне змяненняў у Адзіны МРАІУ;

— падаўжэнне тэрміну абароны правоў праваўладальнікаў на аб'екты ІУ;

— парадак узаемадзеяння мытных органаў і ЕЭК [5].

У сувязі тым, што на дадзены момант Адзіны МРАІУ у ЕАЭС функцыянуе непаўнавартасна, перспектыўным уяўляецца стварэнне агульнай базы дадзеных, якая змяшчае зводную інфармацыю аб абароне аб'ектаў ІУ у дзяржавах — членах ЕАЭС, што стане першым крокам да прывядзення ў дзеянне Адзінага МРАІУ. Дзеля паскарэння ўкаранення Адзінага МРАІУ таксама можна было б звярнуцца да вопыту замежных калегаў (так, у Еўрапейскім саюзе ўжо даўно функцыянуе рэестр аб'ектаў ІУ, каторыя ахоўваюцца правам Еўрапейскага саюза), арганізаваць перадачу ведаў праз правядзенне сустрэч і канферэнцый, куды варта запрасіць замежных спікераў.

Больш за тое, кожная з дзяржаў — членаў ЕАЭС мае ўласныя нацыянальныя рэестры аб'ектаў ІУ, напаўняльнасць каторых значна адрозніваецца, што таксама прыводзіць да развіцця паралельнага імпарту паміж краінамі ЕАЭС. Так, Дзяржаўны мытны камітэт Рэспублікі Беларусь вядзе Нацыянальны мытны рэестр аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці ў адпаведнасці з главой 44 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мытным рэгуляванні ў Рэспубліцы Беларусь», а таксама вызначае парадак яго вядзення. Для ўключэння таварнага знака або іншага аб'екта ІУ у Нацыянальны рэестр праваўладальніку неабходна падаць у Дзяржаўны мытны камітэт заяву аб прыняцці мытнымі органамі мер па абароне правоў

на аб’ект ІУ (працэдура з’яўляецца тыповай) пры наяўнасці дастатковых падстаў меркаваць, што можа мець месца парушэнне яго правоў у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з увозам, або вывазам тавараў, або пры здзяйсненні іншых дзеянняў з таварамі, якія знаходзяцца пад мытным кантролем [6, с. 136].

Такім чынам, ІТ у мытным рэгуляванні і кантролі ў ЕАЭС у цэлым адыгрываюць ключавую ролю, таму што забяспечваюць абмен інфармацыяй і аўтаматызуюць мытныя працэдуры. Іх укараненне таксама спрыяе скарачэнню выдаткаў ды абароне правоў на аб’екты ІУ. Аднак жа развіцце электроннага гандлю бесперабойна стварае новыя выклікі, сярод якіх выдзяляюцца як барацьба з кантрафактам, так і забеспячэнне бяспекі анлайн-транзакцый. Тут даволі важным напрамкам з’яўляецца развіццё супрацоўніцтва паміж праваўладальнікамі і інтэрнэт-платформамі для больш эфектыўнай абароны правоў на аб’екты інтэлектуальнай уласнасці. Для спынення кантрафактных патокаў неабходна выкарыстоўваць шматузроўневую сістэму мытнай абароны правоў на аб’екты ІУ, якая зможа прадугледзець павышэнне эфектыўнасці мытнага кантролю, укараненне ўніфікаванай нарматыўнай прававой базы ды пашырэнне ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва мытных службаў дзяржаў-членаў.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. О товарных знаках и знаках обслуживания Закон Респ. Беларусь от 5 февр. 1993 г. № 2181-XII // КонсультантПлюс. Беларусь (дата обращения: 11.09.2024).

2. Макарчук, С. Параллельный импорт и контрафакт: проблемы и методы борьбы / С. Макарчук // Юрист. — 2017. — № 4. — URL: https://jurist.by/zhurnal/statia/parallelnyj-import-i-kontrafakt-problemy-i-metody-borby (дата обращения: 11.09.2024).

3. Соглашение о торговых аспектах прав на интеллектуальную собственность (Соглашение ТРИПС): [принято в г. Марракеш 15 апр. 1994 г.] // Всемирная организация интеллектуальной собственности. — URL: https://www.wipo.int/wipolex/ru/treaties/details/231 (дата обращения: 11.09.2024).

4. О Стратегических направлениях развития евразийской экономической интеграции до 2025 г.: решение Высшего Евразийского экономического совета от 11 дек. 2020 г. № 12 // Национальный праововй Интернет-портал Республики Беларусь. — URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=F92000439 (дата обращения: 11.09.2024).

5. Договор о Таможенном кодексе Евразийского экономического союз // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=F01700314 (дата обращения: 11.09.2024).

6. Отчет о состоянии правоприменительной практики в сфере защиты прав на объекты интеллектуальной собственности в Евразийском экономическом союзе за 2022 год. М., 2023. — 138 с. // Евразийская экономическая комиссия. — URL: https://eec.eaeunion.org/upload/medialibrary/6dc/Otchet-PPP-za-2022-god.pdf (дата обращения: 12.09.2024).